ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

АДДАЦЬ ГОЛАС ЗА ДАСТОЙНАГА

Спікер верхняй палаты прагаласаваў 18 лютага

Цікавасць людзей да сёлетніх выбараў гаворыць пра неабыякавасць выбаршчыкаў і саміх кандыдатаў, жаданне ўдзельнічаць у жыцці краіны. Пра гэта заявіў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ пасля таго, як прагаласаваў за абранага кандыдата ў Мінгарсавет.

Спікер пахваліў за якасную падрыхтоўчую работу выбарчыя камісіі. «Калі людзі з натхненнем абмяркоўваюць выбары і ідуць аддаць свой голас — гэта кажа пра многае. Ды і кандыдатаў дастойных хапае. Ёсць з каго выбіраць. Пра сябе заявілі людзі з пэўнай жыццёвай пазіцыяй, якія ўсведамляюць сваю адказнасць і ідуць у дэпутаты, каб рэалізаваць не толькі свае амбіцыі, але і патэнцыял», — лічыць парламентарый.

Па яго словах, гэтыя людзі павінны імкнуцца працаваць на карысць насельніцтва ў рамках сваёй выбарчай акругі, горада. «І я ўбачыў такіх сярод кандыдатаў — тых, хто сам хоча будаваць сваю краіну. Гэта трэба вітаць і ўсяляк падтрымліваць, каб спраўдзіліся тыя чаканні, з якімі выбаршчыкі і кандыдаты ішлі на выбары», — падкрэсліў старшыня Савета Рэспублікі.

ШЛЯХ З НЬЮ-ЁРКА Ў БЕЛАРУСЬ

Першы намеснік генсека ААН наведала рэабілітацыйны цэнтр

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, нацыянальны каардынатар па Мэтах устойлівага развіцця Мар'яна ШЧОТКІНА і першы намеснік Генеральнага сакратара ААН Аміна МАХАМЕД наведалі Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў.

Аміну Махамед азнаёмілі з методыкамі работы з дзецьмі ў цэнтры, расказалі пра ўмовы знаходжання ў ім. Мар'яна Шчоткіна на прыкладзе ўстановы паказала, як пры ўзаемадзеянні сістэм аховы здароўя, адукацыі, прыватных партнёраў і валанцёраў арганізавана комплексная паэтапная рэабілітацыя дзяцей.

У час размовы з дзецьмі Аміна Махамед падзялілася ўражаннямі пра Беларусь, расказала пра сябе. «Я люблю сваю работу, таму што магу мець зносіны з рознымі людзьмі. У Беларусі вельмі шмат добрых людзей, і тут, у цэнтры — асабліва. Мы ўсе служым чалавецтву. І гэта выдатна», — сказала яна. Дзеці падзяліліся з госцяй сваімі марамі і планамі. У адказ Аміна Махамед запрасіла іх прыехаць да яе ў госці ў Нью-Ёрк.

ЯНЫ БЫЛІ ПАЧУТЫ

Сенатар правёў прыём грамадзян і прамую тэлефонную лінію

У Магілёве адбылося пасяджэнне Магілёўскага гарадскога выканаўчага камітэта. У яго рабоце прыняў удзел старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей РАХМАНАЎ.

Падчас пасяджэння было разгледжана выкананне комплекснага плана мерапрыемстваў па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў, прафілактыцы іх спажывання і сацыяльнай рэабілітацыі асоб, хворых на наркаманію, на тэрыторыі Магілёва на 2017—2018 гады, а таксама комплексу мер па вырашэнні сацыяльна значных праблем насельніцтва, папярэджанні абгрунтаваных зваротаў грамадзян.

У гэты ж дзень Сяргей Рахманаў правёў асабісты прыём грамадзян, іх прадстаўнікоў і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, а таксама прамую тэлефонную лінію. Грамадзянам, якія звярнуліся, былі дадзены адпаведныя тлумачэнні па пытаннях узаемадзеяння з грамадскімі аб'яднаннямі і партыямі, а таксама процідзеяння незаконнаму абароту наркотыкаў у Беларусі.

Вераніка ПУСТАВІТ.

ВЫБАРЫ-2018

КАГО МЫ ВЫБІРАЛІ?

У ЦВК падвялі папярэднія вынікі галоўнай сёлетняй палітычнай кампаніі

У складзе выбраных дэпутатаў мясцовых Саветаў 28-га склікання амаль палова — жанчыны, а больш за ўсё прадстаўнікоў — ад адукацыі, культуры, навукі, аховы здароўя. Такія звесткі з'явіліся на сайце Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (ЦВК).

Фота БЕЛТА.

Сярод абраных дэпутатаў жанчыны складаюць 48,2 %, грамадзяне ва ўзросце да 30 гадоў — 4 %, грамадзяне Расійскай Федэрацыі — 0,12 %, ці 21 чалавек з 18 110.

Больш за ўсё дэпутатаў занята ў адукацыі, культуры, навуцы, ахове здароўя — 5546 чалавек, або 30,62 % ад усіх выбраных. Прадстаўнікі сельскай гаспадаркі складаюць 3870 чалавек (21,37 %), дзяржаўных органаў — 2398 (13,24 %), прамысловасці, транспарту, будаўніцтва — 1521 (8,4 %). Сярод абраных дэпутатаў — 303 (1,67 %) прадпрымальнікі, 708 (3,91 %) прадстаўнікоў гандлю і бытавога абслугоўвання насельніцтва, 644 (3,56 %) праваахоўных органаў, ваеннай службы, 485 (2,68 %) — пенсіянеры.

Што датычыцца членства ў палітычных партыях, у склад дэпутатаў мясцовых Саветаў увайшло больш за ўсё прадстаўнікоў Камуністычнай партыі Беларусі (305) і Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці (127).

Сярод іншых абласцей Гомельская — самая «маладая», бо тут больш за ўсё дэпутатаў да 30 гадоў, і «жаночая» (2066 жанчын з 3583). У Мінскай вобласці больш за ўсё прадстаўнікоў Камуністычнай партыі Беларусі (100 дэпутатаў). Больш за ўсё пенсіянераў у Віцебскай вобласці (136 чалавек), а непрацуючых — у Гомельскай (29 чалавек). Амаль ва ўсіх абласцях па сферах дзейнасці дэпутатаў лідзіруюць адукацыя, культура, навука, ахова здароўя, акрамя Гродзенскай вобласці — там больш дэпутатаў, якія займаюцца сельскай гаспадаркай. Прытым у сталіцы частка партыйных дэпутатаў досыць значная — амаль 30 %, у той час як па абласцях гэта лічба не перавышае 5 %. Усе сталічныя дэпутаты працаўладкаваны, сярод іх няма ні аднаго пенсіянера.

Дэпутаты пачнуць работу праз месяц пасля выбараў, а магчыма, і раней. «Да сярэдзіны сакавіка ўсе мясцовыя Саветы дакладна запрацуюць», — сказала **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня ЦВК.** Па яе словах, у цэлым працэс выбараў прайшоў дастаткова спакойна. Скаргаў, канфліктаў няшмат. «На канфлікт ідуць толькі мясцовыя назіральнікі. Што датычыцца ўзаемаадносін з міжнароднымі назіральнікамі, ні аднаго звароту ў ЦВК пра тое, што дзесьці назіральніку не аказалі належны прыём, не паступала, і я спадзяюся, што не паступіць», — заявіла днямі журналістам Лідзія Ярмошына.

На яе думку, добра спрацавалі органы ўлады на месцах і лепш, чым звычайна, — самі каманды кандыдатаў у дэпутаты. «Яны праводзілі значна больш агітацыйных мерапрыемстваў, паспрабавалі, нарэшце, асвоіць выбарчыя фонды, — адзначыла старшыня ЦВК. — У нас практычна няма скаргаў ад выбаршчыкаў, што яны не атрымалі інфармацыйны матэрыял. Яны скардзіліся на аб'ём гэтага матэрыялу — ім хацелася б больш. Але галоўнае, што выбаршчыкі былі праінфармаваныя», — падкрэсліла яна.

Выніковае пасяджэнне па выніках выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў адбудзецца ўжо сёння, 23 лютага.

Вераніка ПУСТАВІТ.

АБМЕРКАВАННЕ

РАЗАБРАЦЦА, КАБ ПРЫНЯЦЬ

На вясенняй сесіі Палаты прадстаўнікоў плануецца правесці другое чытанне праекта абноўленага Банкаўскага кодэкса

Але, каб прыняцце праекта праходзіла ў штатным рэжыме, неабходна азнаёміцца з ім ушчыльную, атрымліваць адказы ад прафесіяналаў. Пра гэта заявіла старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Людміла ДАБРЫНІНА на круглым стале па абмеркаванні праекта закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Банкаўскі кодэкс Рэспублікі Беларусь».

Пры падрыхтоўцы законапраекта да другога чытання паступіла больш за 25 заўваг і прапаноў ад Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета Рэспублікі, галоўнага прававога і рэдакцыйнага ўпраўлення сакратарыята Палаты прадстаўнікоў, Камітэта дзяржаўнага кантролю, міністэрстваў фінансаў і юстыцыі. Актыўны ўдзел у рабоце над дакументам прымаюць дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі.

Спікер мерапрыемства адзначыла, што нормы законапраекта прыведзены ў адпаведнасць з Указам № 371 «Аб Беларускім міжбанкаўскім разліковым цэнтры» і Дэкрэтам № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва». Людміла Дабрыніна звярнулася да прысутных на пасяджэнні банкіраў з просьбай выказаць свае заўвагі і прапановы з улікам існуючай практыкі, асабліва па артыкуле, які датычыцца крэдытавання насельніцтва, таму што менавіта яму дэпутацкі корпус удзяляе асаблівую ўвагу.

У пасяджэнні круглага стала прыняў удзел **старшыня Асацыяцыі беларускіх банкаў Аляксандр КУЧЫНСКІ,** які расказаў, што члены асацыяцыі па просьбе Нацбанка некалькі разоў рыхтавалі свае прапановы ў кодэкс. «Хацелася б пачуць, наколькі яны ўключаныя ў абноўлены дакумент», — адзначыў ён.

Актыўны ўдзел у мерапрыемстве прынялі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў — члены Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах, адкрыта падзяліліся думкамі таксама старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір Панцюхоў і намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка Дзмітрый Лапко. «Разгляд законапраекта ў другім чытанні Палатай прадстаўнікоў запланаваны падчас вясенняй сесіі парламента, якая пачне работу 2 красавіка», — паведаміла Людміла Дабрыніна.

Сяргей КУРКАЧ.